# Білет аказаўся шчаслівым...

(Пачатак на 1 стар.)

*фабрыкі, новабудоўлі, падымаліся на вяршыні Каўказа, паспрабавалі на смак соль Кара-Багаз-Гола, пакупаліся ў Чорным моры. Хіба ж гэта не дапамагае ім цяпер на экзамене? Адказвае Ніна Махлай. Яна поўна, дакладна расказвае аб прамысловасці паўночна-ўсходняй Украіны, у прыватнасці, буйнага прамысловага цэнтра Украіны—Харкава. А як жа інакш? Дзяўчына там пабывала. Дацэнт Іван Іванавіч Трухан ставіць дзяўчыне «добра».*

*Сямён Кручок, якому папалася пытанне «Прамысловасць Поўначы СССР», спачатку спыняецца на тым непрыглядным становішчы багатага някранутага краю, якое мела Поўнач да рэвалюцыі. Студэнт падрабязна расказвае аб этапах развіцця, аб асваенні вялізных багаццяў Поўначы за час Савецкай улады.*

*Выкладчык ставіць студэнту «выдатна». Заслужаная адзнака. З лёгкай рукі Сямёна Кручка «выдатна» атрымалі Уладзімір Маліноўскі, Валянцін Лукашоў, Дзмітрый Цяцера. Добра адказвалі Валеры Малаглавец, Фаіна Рабышэўская, Мікола Салавей, Вячэслаў Шыц і іншыя. З 25 чалавек гэтай групы толькі адзін атрымаў «нездавальняюча».*

*Разам з тым нельга не адзначыць, што ў будучых географаў пакідае чакаць лепшага культура мовы.*

* * *

*Экзамены пачаліся. І трэба іх паспяхова здаць. Уперадзе ж—канікулы, шчаслівы студэнцкі адпачынак.*

**Р. ЗАЛЕСКІ.**

АГЛЯД ДРУКУ

# Бліжэй да жыцця

Таленавіты савецкі паэт Уладзімір Уладзіміравіч Маякоўскі пісаў: «Газета—наши глаза и руки, помощь ежедневная в ежедневной работе». Якія глыбокія і справядлівыя словы! Іх поўнасцю можна аднесці і да насценных газет. А такіх у нас, ва ўніверсітэце, нямала. Яны заклікаіы адлюстроўваць жыццё факультэтаў, змагацца за высокую паспяховасць, за камуністычнае выхаванне студэнтаў. Паглядзім, як спраўляюцца з гэтымі задачамі насценныя газеты факультэтаў.

Газета **«За мічурынскую біялогію»** слаба звязана з студэнцкім калектывам, не адлюстроўвае жыцця акадэмічных груп і курсаў. З 10—12 артыкулаў, што змяшчаюцца ў газеце, толькі 2—3 у нейкай ступені звязаны з жыццём біяфака. У асноўным жа газета запаўняецца матэрыяламі, у якіх расказваецца аб распрацоўцы той або іншай праблемы ў біялогіі. А такая газета нічым не адрозніваецца ад звычайнага бюлетэня студэнцкага навуковага таварыства.

Насценная газета фізічнага факультэта як быццам бы больш увагі і месца адводзіць паўсядзённаму жыццю. Вось адзін з апошніх нумароў. На першым плане—выступленні камуністаў на партсходзе. Матэрыял важны. Але газета павыхоплівала з гэтых выступленняў толькі агульныя фразы. Таму матэрыялы губляюць сваю надзённасць і мэтанакіраванасць. Да таго ж, газета не называе канкрэтных асоб.

**«Савецкі фізік»** крытыкуе гультаёў, што спяць у час заняткаў, тых, хто не хоча берагчы народнае дабро. Але і гэтыя матэрыялы пададзены казённа. Рэдакцыя не выказала сваіх адносін да прыводзімых фактаў; яна абмежавалася толькі тым, што зафіксіравала іх.

«Савецкі фізік» бярэцца знаёміць сваіх чытачоў з сістэмай вышэйшай адукацыі ў ЗША. І, трэба сказаць, што робіць гэта з пахвальным стараннем і веданнем справы. Але для чаго ўсё гэта?

Насценная газета **«Савецкі хімік»** імкнецца цясней звязацца са сваімі чытачамі. З нумара ў нумар змяшчаюцца падборкі матэрыялаў аб лепшых студэнтах хімфака. Выгадна вылучаецца сярод іншых і сатырычны аддзел «Хромавая сумесь». Аднак, трэба адзначыць што ў большасці артыкулаў няма мэтанакіраванасці, напісаны яны шэрай і невыразнай мовай.

Дарэчы, аб матэрыялах, якія прысвячаюцца лепшым студэнтам факультэта. Газета вельмі ўжо захапляецца «ясными очами» і «бесконечно милыми улыбками» сваіх гераінь і герояў. А чытачу важна ведаць, якім чынам стаў гэты студэнт лепшым на факультэце, якая яго роля ў калектыве. Хочацца пажадаць рэдкалегіі «Савецкага хіміка» больш сур'ёзна ставіцца да такіх матэрыялаў.

Мы бегла азнаёміліся са зместам некаторых факультэцкіх газет. Малюнак несуцяшальны. Многія рэдакцыі не спраўляюцца з пастаўленымі задачамі. Партыйныя арганізацыі факультэтаў павінны ўзмацніць кіраўніцтва насценным друкам, а калі гэта спатрэбіцца, змяніць і ўзмацніць склад рэдкалегій. Кожная насценная газета павінна быць баявым памочнікам партыйнай арганізацыі ў барацьбе за выхаванне сапраўдных будаўнікоў камунізма, за падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў.



***

У разгары зімовы спартыўны сезон. Гаравую дарожку стадыёна замяніла спартыўная зала, дзе працягваюць удасканальваць сваё майстэрства лёгкаатлеты нашага ўніверсітэта, рыхтуючыся да прадстаячых спартыўных баталій.

**НА ЗДЫМКУ:** член лёгкаатлетычнай секцыі студэнт II курса філалагічнага факультэта Мікалай Гаўрычэнка на трэніроўцы.

Фота **В. АНЦЫФЕРАВА**

***

# *Творчасць нашых сяброў*

☆ ☆ ☆ ☆ ☆

* *

Нядаўна на базе літаратурных аб'яднанняў вышэйшых навучальных устаноў горада Мінска было створана агульнае літаб'яднанне студэнтаў (СЛАМ). На першым пасяджэнні гэтага аб'яднання прысутнічаў вядомы беларускі крытык Рыгор Бярозкін. Ён зрабіў агляд творчасці маладых аўтараў, адзначыў істотныя недахопы ў творах. Сіламі літаб'яднання будзе выдадзен зборнік творчасці яго членаў, які выйдзе прыкладна ў 1963 годзе.

Сёння мы знаёмім нашых чытачоў з некаторымі творамі нашых сяброў, маладых паэтаў А. Сухамлінава, М. Стрыгалёва, Л. Кліменка, В. Унуковіча, А. Сакалоўскай і І. Трубачова.

## О Родине

*Родина, поясом рек опоясанная,*
*Здесь ты со мною*
*И в дальних краях,*
*С гордой усмешкой и взглядами ясными,*
*С ночами в соловьях...*
*Сколько идти нам дорогами трудными,*
*Сколько изведать тревог!*
*Шаг твой чеканный*
*Колхозными буднями*
*В стих незаконченный лёг...*

**М. СТРИГАЛЁВ.**
Политехнический институт.

## Разве много...

**Разве много мне в жизни надо?**
**Шелест веток цветущего сада,**
**Вдоль идущая тропка снежная,**
**Ласка девичья, добрая, нежная.**

**Мне, как воздух, нужна работа.**
**Не какая-нибудь, а до пота.**
**Друг хороший и добрый рядом...**
**Разве много мне в жизни надо?..**

**И. ТРУБАЧЕВ.**
Медицинский институт.

* * *

*Вдруг кто-нибудь скажет открыто:*
*Плохие, мол, пишешь стихи.*
*И горло мне сдавит обида,*
*Что строки корявы, сухи.*

*Как в зной холодная фляга,*
*Мне нужно для жизни перо.*
*И сердце моё под рубахой*
*Стучит от стихов о ребро.*

*Когда б даже был палачами*
*Казнён, и тогда б голова*
*Вдруг стала б царапать зубами*
*Стихов неуклюжих слова.*

**А. СУХОМЛИНОВ.**
Политехнический институт.

## Радуга

Хмурое утро вдруг улыбнулось
Сквозь дождевые плетни.
Солнце мне радугу протянуло,
Словно сказало: возьми заплети...

Пусть засияет в косичке светлой
Блеск семицветных огней!
Только мала я для ленты этой,
Не дотянулась к ней...

**А. СОКОЛОВСКАЯ.**
Медицинский институт.

## Бетон

**Следы и ссадины на нём,**
**Ветров ожоги, слизь дождей,**
**Фундамент весь порос пырьём,**
**Оплетен сетью их корней.**

**Прошли года, а он звенит,**
**И даже крепче, звонче стал.**
**Из жидкой массы—он, гранит,**
**Несокрушимый, как металл.**

**В. УНУКОВИЧ.**
Политехнический институт.

* * *

*Снова приходит весна:*
*Ни снега,*
*Ни льда,*
*Ни пороши.*
*Весна—значит, нет больше сна,*
*И только есть ты, мой хороший.*

*Травой ощетинился луг.*
*Вздохнули в тумане рощи.*
*Кто-то позвал меня вдруг?—*
*Ветер*
*иль ты, мой хороший?..*

**Л. КЛИМЕНКО.**
Институт иностранных языков.



Віталі АНЦЫФЕРАЎ

*

ФОТАЭЦЮД

*

УДАЛЫЯ ВЫСТРАЛЫ

ПІСЬМО Ў РЭДАКЦЫЮ

# Чаму мы на апошнім месцы?

*Праведзены агляд на лепшы інтэрнат універсітэта па бытавому абслугоўванню вызначыў нашаму інтэрнату № 4 (вуліца Дзімітрава) апошняе месца. Асабліва нездавальняючы парадак быў выяўлен там, дзе пражываюць студэнты юрыдычнага факультэта. Падлога ў калідоры першага паверху брудная, на сценах—пыл, у многіх пакоях поўны беспарадак.*

*У чым жа прычына такога становішча, ці ўсе студэнты дрэнна адносяцца да сваіх абавязкаў па ўборцы?*

*Аказваецца, не. Праведзены за апошні час рад рэйдаў па інтэрнату даў магчымасць устанавіць, што ёсць у нас таварышы, якія ўзорна ўтрымліваюць свае пакоі. Да такіх адносяцца пакоі № 19 (стараста Капніцкі), № 61 (стараста Вадзянова), № 67 (стараста Брахуноў), № 47 (стараста Каспур) і рад іншых пакояў.*

*Нажаль, такіх пакояў нямнога, большасць жа іх выглядае зусім не так. Асабліва дрэнны парадак у пакоях, якія займаюць студэнты чацвёртых і пятых курсаў. Лічачы сябе ўжо «бачыўшымі віды», яны лічаць за лепшае жыць у брудзе. Так, камісія прафкома выявіла ў 21-м пакоі карты, на падлозе—бруд і цкуркі. 15 лістапада студсавет сумесна з камсамольскім бюро правялі рэйд, і зноў у тых жа пакоях—29, 90, 21, 20—аказаўся беспарадак.*

*А пакой 90-ы, дзе стараста камсамолец Глазкоў, заўсёды сустракае рэйдавую камісію ў штыкі, у адрас членаў сантройкі ляцяць абразы: «А можа ў мяне на падэшве знойдзеце пыл?».*

*Праведзеныя рэйды таксама ўстанавілі, што студэнты безадказна адносяцца да дзяржаўнай маёмасці, ламаюць крэслы, псуюць канапы і сцены. Ёсць яшчэ сярод нас людзі, якія не хочуць прызнаць культуру быту, лічаць гэта справай другараднай.*

*Прамы абавязак усіх нашых камуністаў, камсамольцаў — не толькі самім быць прыкладнымі ў быту, але і не праходзіць міма фактаў парушэння правілаў сацыялістычнага грамадскага жыцця, прывіваць іншым пачуццё адказнасці за парадак у пакоях, у інтэрнаце, а калі патрэбна, то і спаганяць з неахайных.*

**Я. ПАШКОЎ,**
член камсамольскага бюро юрыдычнага факультэта.

# Давайце спаборнічаць!

**З мэтай стварэння лепшых жыллёва-бытавых умоў і актыўнага адпачынку студэнты ўсіх інтэрнатаў універсітэта ўключыліся ў сацыялістычнае спаборніцтва. Студэнты матэматычнага факультэта спаборнічаюць з фізікамі. Жыхары інтэрната № 4, што па вуліцы Дзімітрава, выклікалі на спаборніцтва філолагаў.**

**Удзельнікі спаборніцтва абавязаліся:**

**Утрымліваць жылыя пакоі, калідоры, кухні і ўмывальнікі ў належным санітарным становішчы, ленпакоі і чытальныя залы—ва ўзорным.**

**Праводзіць у ленпакоях вечары адпачынку студэнтаў, наладжваць сустрэчы з перадавікамі вытворчасці, старымі камуністамі, заслужанымі настаўнікамі і іншымі.**

**У дні адпачынку праводзіць турысцкія паходы і лыжныя прагулкі.**

**Беражліва адносіцца да сацыялістычнай маёмасці.**

**Строга выконваць правілы ўнутранага распарадку.**

**У кожным інтэрнаце правесці спартакіяду.**

**Разгарнуць спаборніцтва паміж паверхамі і за лепшы пакой на паверсе. Пераможцу будзе ўручан пераходны вымпел—«Лепшаму інтэрнату БДУ імя Леніна». Найбольш актыўныя ўдзельнікі конкурсу будуць адзначацца прафкомам і рэктаратам.**

**У цяперашні час вымпелам валодаюць студэнты матэматычнага факультэта.**

**Студсаветы, прафбюро факультэтаў павінны ўцягнуць у спаборніцтва ўсіх студэнтаў, пражываючых у інтэрнатах.**

**А. ЦАЛКО,**
старшыня жыллёва-бытавой камісіі прафкома ўніверсітэта.

Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.

НАШ АДРАС:
Мінск,
Універсітэцкі гарадок,
біякорпус, 31;
Тэлефон: 2-07-19.
Друкарня выдавецтва
БДУ імя Ул. І. Леніна.

АТ 06219 Зак. 106.